…ЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

30 сьнежня 1931 г. № 305 (1569)

Чырвоная Зьмена

…РАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

4-ты пленум ЦК ЛКСМБ

Менск—Дом комсамолу

Ранішняе пасяджэньне 28-XII з. г.

Праверка выкананьня рашэньняў ЦК УсеЛКСМ

Аб рабоце з актывам і конкрэтным кіраўніцтве

Спрэчкі па дакладу тав. ПАЛЯКОВА

Завяршыць перабудову работы

IV …енум ЦК ЛКСМБ заслухаў …кла аб рабоце комсамолу ў галіне …кыш…яўленьня дырэктыў ЦК …еК(б) і СНК СССР аб чыгуначным …ранс…рце.

Пле…м падвядзе вынікі працы ком…мол… і вызначыць шляхі далейшай …абот… чыгуначнага комсамолу і …ЛКСМБ на гэтым адказьней… …ым …частку.

…К …нуму рад комсамольскіх арга…зацы… прынёс рапарты аб сваіх …рам…ах і дасягненьнях. Багата …ыг…ых старонак барацьбы за …дар… транспорт запісалі комсамоль…кія …ганізацыі ў гісторыі чыгунач…ых …лоў.

Х…бе не па-бальшавіцку працуюць …аравыя брыгады „Э—44" імя …Ком…мольскай праўды"? Яны пака…залі …ыклад, як можна дабіцца нячу…ан… паказчыкаў у экономіі апалу, …ва…аньні здаровага паравоза.

Пр…клады паказваюць і комсамоль…кія …ыгады ст. Жлобін па рамонту …ара…аў. Ударна працуюць кандук…арс… брыгады Шулькіна і Шчукіна, …рык…дным зьяўляецца паравоз імя …Чыр…най Зьмены".

Гэ… ганаровы сьпіс можна працяг…ваць далей. Справай гонару ўсяго …ЛКСМБ і чыгуначнага комсамолу, у …перш… чаргу зьяўляецца самаадданая …бара…ба за здаровы паравоз, за ўдар…ае …равядзеньне асеньня-зімовых …пера…зак.

Па… кіраўніцтвам партыі комса…мол …вяршыў барацьбу на транспар…це р…аючымі посьпехамі.

Ал… гэтыя посьпехі нас задаволіць …ня м…гуць. Яны ня могуць задаволіць …таму, што транспорт яшчэ адстае, …што …атрэбнага пералому, такога, …якога …акае і за які змагаецца пар…тыя… пролетарыят, яшчэ няма.

Тр…спорт па-старому застаецца вуз…кім …сцам. Абломаўшчына, опортун…стычн… непаваротнасьць, спасыланьне на о…ктыўныя прычыны, нежаданьне …ўнес…і карэнную ломку і перабуда…ваць… па-новаму, адпаведна з новым …ўмов…і—усё тое, што характарызуе …гор… від опортунізму яшчэ знахо…дзіц… сабе прытулак у цэхах дэпо, на п…авозах, на тармазох, у канторах і т…х…чных бюро транспорту.

І …сувязі з гэтым неабходна карэн…ная …мка ўсёй сыстэмы работы ком…само… на транспорце.

Н…бходна такая ломка, якая-б за…бясь…чыла штодзённым кіраўніцтвам комс…мольскую групу, дыфэрэнцыя-ванае кіраўніцтва, уважлівыя і чулыя адносіны да кожнай брыгады, да кожнага ўдарніка паасобку.

А ў галіне конкрэтнага кіраўніцтва, у гал…не неабходнай опэрацыйнасьці мы яшчэ недапушч…льна адстаем.

Аб чым сьведчыць той факт, што сакратар адной з комсамольскіх ячэек колектыву цягі Менску—Маслоў—ня ведае аб тым ці існуе у дэпо ўдарная комсамольская брыгада. Гэты-ж таварыш Маслоў, будучы на чале брыгады, паставіў малавопытную брыгаду на адно з перадавых месц у дэпо. Нячулыя адносіны, адсутнасьць увагі і клапот да герояў нашых будняў прывялі да таго, што Маслоў пакінуў брыгаду. Ніхто не рэагаваў на гэта і зараз н…водзін член колектыву цягі ня ведае—працуе брыгада ці не.

Нажаль, гэты прыклад не адзінкавы. Слабая працоўная дысцыпліна на транспарце, прагулы, спальваньне букс, зрывы опар…най язды, ігнараваньне гаспадарчага разрахунку—усё гэта вынікі незавершанай перабудовы.

Выязныя рэдакцыі „Чырвонай зьмены" на важнейшых вузлох БССР скончылі сваю работу. Распачынае працу выязная рэдакцыя на Менскім вузьле. Там, дзе гарадзкая організацыя комсамолу пры дапамозе нашых выязных рэдакцый здолела хутка перакл…чыцца, перабудаваць работу па прынцыпах 6 умоў т. Сталіна, на падставе загаду т. Андрэева,—там вызначыўся пералом, там цьвёрды і ўпэўнены першы крок.

Гэты крок ужо зроблен у Віцебску Магілёве, Гомелі і Воршы. Гэты крок павінен зрабіць і менскі комсамол.

На парадак дня—ня спыняцца на дасягнутым. У Магілёве ўжо супакоіліся, там работа спынена.

—Рана, таварышы!

Комсамол пад кіраўніцтвам партыі павінен адыграць рашаючую ролю ў перабудове транспорту. Гэтаму абавязваюць павышаныя задачы 4-га заключнага, напярэдадні якога мы стаім. Гэтаму абавязвае пэрыод асеньня зімовых перавозак. Гэтаму абавязваюць задачы падрыхтоўкі комсамольскага рапарту XIV усебеларускаму і XVII усесаюзнай конфэрэнцыі.

Не паслабляць увагі на адказным вучастку; транспорт — напярэдадні вялікага пералому.

Гэты пералом павінен быць завершаны з посьпехам.

Царэнцоў—Талочына

У дыфэрэнцыяцыі кіраўніцтва зрабіць карэнны пералом

Пастаноўка пытаньня аб рабоце з актывам зараз як ніколі, набывае вялікае палітычнае значэньне. А асабліва гэта вызначаецца ў сувязі з тымі вялікімі задачамі, якія перад намі ставіць сучасны этап соцыялістычнага будаўніцтва і задачамі замацаваньня новаўліўшагася папаўненьня ў радох ленінскага комсамолу.

У нашым раёне каля 75 проц. комсамольцаў уцягнуты ў палітвучобу. Асноўныя недахопы—гэта слабая ўвязка тэорэтычнай вучобы з практычнай работай, адсутнасьць падрыхтаваных і адпаведнага методычнага кіраўніцтва. АПТУ ЦК, было для забясьпечаньня вясковых раёнаў адпаведнымі праграмамі і кіраўніцтвам. Справа палітвучобы ўскладняецца ў сувязі са спэцыялізацыяй раёнаў. Патрэбны дыфэрэнцыяваныя програмы, і якраз тут мы маем вялікія недахопы.

Цяпер некалькі слоў аб нашым кіраўніцтве. Мне здаецца, што ў дыфэрэнцыяцыі кіраўніцтва карэннага пералому мы яшчэ не дабіліся, пачынаючы нават з ЦК і асабліва РК КСМ. Гэта кіраўніцтва ўсё яшчэ застаецца агульным.

Наш пленум павінен закласьці гэтаму канец.

Тав. Каганскі—сакратар камітэту КСМ Гомсельмашу

Перабудова работы забясьпечыла перамогу

ЛКСМБ, як адзін з атрадаў УсеЛКСМ, зьяўляецца баявым памочнікам нашай партыі ў пасьпяховым выкананьні пяцігодкі за 4 гады. Гомельская комсамольская організацыя заваявала грандыёзнейшых посьпехаў у выкананьні прамфінпляну.

Цэлы рад прадпрыемстваў выканаў сваю пяцігодку ў 2 з паловаю, у 3 гады. Такімі зьяўляюцца Палесдрук, фабрыка Комінтэрн. Зда…ым нам пасьпех—сьведка перабудовы комсамольскай работы. У кожнай вытворчай брыгадзе на Гомсельмашы організаваны комсамольскія групы, якія ахапілі змагаюцца за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. Механічны цэх, напрыклад, які з'яўляецца ў нас самым вузкім месцам, прамфінплян выконваецца на 30-40 пр. А зараз, у сувязі з перабудовай работы, мы дабіліся вываду механічнага цэху з прарыву.

Ёсьць яшчэ адзін вялікі недахоп, мы часам у сваёй барацьбе за выкананьне прамфінпляну ня ўвязваем з вылучэньнем моладзі, з замацаваньнем яе ў комсамоле. Значны недахоп і ў конкрэтным опэрацыйным кіраўніцтве. Мы яшчэ не навучыліся прыстасоўваць сваю работу да патрэб асобнай вытворчасьці, значным злом у нашай рабоце зьяўляецца агульнасьць. Гэта недахоп таксама і кіраўніцтва асобных аддзелаў ЦК.

Аб рабоце з актывам. Трэба прызнаць, што ў гомельскай організацыі гэта работа пастаўлена не належным чынам. Пасобныя актывістыя сваіх тэорэтычных ведаў. Гэта навет у пасобных выпадках надмаючы навічкоў. Новыя задачы нашай работы ставяць рубам пытаньне аб узброеньні актыву марксысцка-ленінскімі ведамі.

Рутэнбэрг—Ветка

Падрыхтоўку кадраў—у цэнтр увагі

Пастаноўка пытаньня аб конкрэтным кіраўніцтве і рабоце з актывам вызначаецца з тэй завостранай важнасьцю гэтага пытаньня, якую надаў яму апошні пленум ЦК ЛКСМ. Тым большае значэньне гэта мае ва ўмовах ЛКСМБ.

Конкрэтнае кіраўніцтва і падрыхтоўка актыву—пытаньні неадлучныя. Конкрэтнае кіраўніцтва патрабуе падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі актыву, патрабуе штодзённай сыстэматычнай работы з актывам і праверкі яе практычнай дзейнасьці. Перападрыхтоўка, ня кажучы ўжо аб …, навет і сярэдняга актыву ў нас пастаўлена дрэнна. Асабліва дрэнна становішча з падрыхтоўкай прапагандысцкіх кадраў. Тым часам выкананьне гэтай задачы дало-б нам магчымасьць належным чынам пастаўіць палітвучобу нашай моладзі.

Лявін—Віцебск ГК КСМ

Ня гутаркі, а опэрацыйнае кіраўніцтва патрабуецца ад нас

Віцебская організацыя за апошні год узрасла на 9500 чал. Перад комсамольскай організацыяй паўстала задача—перабудаваць усю сваю работу, каб замацаваць гэты вялікі прыліў, садзейнічаць уключэньню ўсіх навічкоў у актыўную барацьбу на фронце соцыялістычнага будаўніцтва.

Аднак, у замацаваньні навічкоў мы маем яшчэ цэлы рад недахопаў. Яшчэ ня ўсе яны ахоплены марксысцка-ленінскай вучобай, ня ўсе яшчэ маюць нагрузкі. Ня гледзячы на неаднакратныя пастановы аб перабудове ўсёй работы і асабліва сыстэмы кіраўніцтва, мы вельмі часта абмяжоўваемся толькі гутаркамі, і яшчэ не дабіліся сапраўднай перабудовы і належнага опэрацыйнага кіраўніцтва. Пленум ЦК павінен зараз палажыць канец гэтаму адставаньню, без чаго нам ня вырашыць усіх пастаўленых перад намі задач.

У нас часта пачатая справа не даводзіцца да канца. Між тым опэрацыйна кіраваць—гэта значыць належным чынам забясьпечыць заканчэньне. У нас у гэтым напрамку зусім недастаткова пастаўлена работа. Пленум павінен даць выразную, конкрэтную ўстаноўку ў гэтым пытаньні. Перад намі стаіць задача: распрацаваць цэлы рад конкрэтных мерапрыемстваў у пытаньнях падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі нашага актыву.

Тав. Снапкоў—Магілеў

Праверку выкананьня—у сыстэму работы

Пытаньне конкрэтнага кіраўніцтва набывае ў нас вялізарнейшае значэньне ў сувязі з тым вялікім ростам, які мы маем у апошні час і, па-другое,—са спэцыфічнымі ўмовамі нашай рэспублікі. Наша гаспадарка мае цэлы рад ухілаў, як сьвінагадоўля, ільнаводзтва і г. д. Гэта з усёй вастрасьцю патрабуе дыфэрэнцыяванага кіраўніцтва. Мы ў гэтым, праўда, дабіліся пэсь пехаў, але ў нашым кіраўніцтве наглядаецца яшчэ шматагульнасьці, павярхоўнасьці, наглядаецца адсутнасьць выразнасьці, конкрэтнай пастаноўкі кіраўніцтва на пасобных вучастках гаспадаркі.

Далей я хачу спыніцца на выступленьні т. Канопіка. Ён проста зводзіць паклёп на вясковыя комсамольскія організацыі. Мы сапраўды маем рад недахопаў у рабоце колгасных ячэек. Але зараз комсамольскія ячэйкі павярнуліся да вырашэньня асноўнай задачы—організацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня колгасаў і актыўна працуюць на гэтым вучастку. Два месяцы таму назад мы абвясьцілі па Магілеўскай організацыі конкурс на організацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню колгасаў і саўгасаў. Мы ў гэтым конкурсе ставім дзьве асноўныя задачы. Першая—гэта замацаваньне колгасаў і наладжваньне работы ў саўгасах і другое—у сувязі з гэтым—замацаваньне саміх колгасных ячэек, а разам з гэтым—выкананьне ўсіх гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў. Аднак, гэта мерапрыемства не атрымала належнага падтрыманьня пасобных аддзелаў ЦК і „Чырвонай зьмены". У выніку гэтага конкурсу мы дабіліся наладжваньня работы ўсёй комсамольскай організацыі, вялікіх посьпехаў у пераводзе колгасаў на гаспадарчы разрахунак і правільнага разьмеркаваньня ўраджаю.

У справе праверкі фактычнага выкананьня мы таксама маем дрэннае становішча. У нас ўсё яшчэ правяраюць у габінэтах. Так робяць райкомы і нават ЦК. Так правяраць далей нельга.

М…білізаваць рацыяналі…атарскую думку!

П… рацыяналізатарскаму пляну 193… г. Менская абутковая фабры…ка …вінна была даць 220 тысяч руб. …кономіі. Для ажыцьцяўленьня гэта… пляну было прадугледжана пас…віць значную колькасьць новых машын і правесьці рад іншых мер…рыемстваў. І хаця машыны ня …лі пастаўлены, усё-ж …гадовы …ая фабрыка выканала за тры квар…алы.

З… 1-ы квартал было падана 58 раб…х прапаноў, рэалізацыя якіх дал… 62614 руб. экономіі. Гэта ўжо скла…е 117 проц. квартальнага пляну. … 2-м квартале ўнесена 42 раб…ыя прапановы, што дала 626… р. экономіі, альбо 110 проц. дэк…нага пляну. 3-ці квартал даў 20 …рапаноў—экономі, 97400 руб. або 71 проц.

З… першыя 2 месяцы 4-га квар…тал… было атрымана таксама 65 пра…ноў. 4-ы квартал павінен дац… 125 тысяч руб. экономіі. Як від…ь з папярэдніх падлікаў, і гэт… плян будзе перавыкананы.

…бы сьведчаць аб вялікіх перамогах абутковай фабрыкі ў галіне рацыяналізацыі. Адначасова яны сьведчаць і аб тым, што прыток прапаноў у 3-м квартале значна зьнізіўся ў параўнаньні з першым. Тут ужо трэба ўспомніць аб слабой работце ІТР.

Комсамольская організацыя фабрыкі адыграла ў барацьбе за рацыяналізатарскі плян вялікую ролю. Комсамол узяў шэфства над рабочымі прапановамі. У кожнай ячэйцы былі створаны штурмавыя комсамольскія брыгады. Багата прапаноў далі самі комсамольцы. Першая комсамольская ячэйка швэйнага цэху за 4 дні пасьля абвяшчэньня штурму сабрала 10 прапаноў, некаторыя з іх даюць экономію ў 1000 руб.

Вопыт рацыяналізатарскай работы комсамолі абутковай фабрыкі павінен быць выкарыстаны ўсёй комсамольскай організацыяй, каб даць сотні тысяч рублёў соцыялістычнаму будаўніцтву.

Брыгада „Ч. З."

І. Бэйнэнсон. А. Шафран

Стаўка опортуністых біта

Б…БРУЙСК. Адбыўся зьлёт удар…нік… швэйнай фабрыкі імя Дзяржын…скаг… Зьлёт падвёў вынікі выкананьня пля… першых 3-х кварталаў гэтага гас…дарчага году.

…працягу доўгага часу фабрыка сы…матычна ня выконвала прамфін…пля… Асноўныя прычыны — слабая пер…удова ўсёй работы партыйных, про…саюзных і комсамольскіх организа…цы…й, нежаданьне перабудаваць яе па-…аму, опортуністычныя адносіны да …воўнейшых задач сучаснасьці.

…і як магла фабрыка выканаць прамфінплян, калі былое кіраўніцтва ігнаравала шэсьць указаньняў тав. Сталіна; дрэнна пастаўлена было рабочае забясьпечаньне, не організаваны набор рабочай сілы.

Ударнікі адзначылі, што опортуністычная спадчына мінулага яшчэ цалкам не ліквідавана.

На аснове карэннай перабудовы работы, ажыцьцяўляючы шэсьць указаньняў т. Сталіна, фабрыка сустрэне 4-ы заключны падрыхтаванай.

С. П. і Швэйнік.

Напярэдадні чацьвертага заключнага

Перавод на прэміялку

дае сыстэматычнае выкананьне прамфінпляну

Комсамольская ячэйка ліцейнага цэху заводу „Комунар" ідзе ў першых радох па рэалізацыі програмнай прамовы т. Сталіна.

Раней з наборам рабочае сілы ў цэху была звычайная цякучасьць. Зараз цэх пры актыўным удзеле комсамольскай ячэйкі заключыў дагавор з колгасамі падшэфнага Карапішчанскага сельсавету.

На прэміяльна - прогрэсыўную зьдзельшчыну па цэху праведзена 97 проц. усіх рабочых.

Новая сыстэма аплаты працы прывяла да сыстэматычнага перавыкананьня прамфінпляну і зьніжэньня браку.

За верасень месяц цэх выканаў прамфінплян на 116 проц., за кастрычнік на 123 проц., за лістапад на 113.

З кожным месяцам ішло сыстэматычнае зьніжэньне браку: у верасьні брак складаў 11,6 проц., у кастрычніку 11 проц., а ў лістападзе ўжо 9 проц.

2 брыгады ліцейнага цэху пераведзены на гаспадарчы разрахунак Але да апошняга часу брыгады ня ведалі аб эфэктыўнасьці сваёй работы. Ячэйка вылучыла 2 комсамольцаў, якія з дапамогай пляновага аддзелу падводзяць вынікі работы брыгады.


Комсамольцы ліцейнага цэху прымаюць актыўны ўдзел у праверцы колдумовы. У працы праверачных брыгад удзельнічаюць звыш 80 пр. комсамольцаў цэху.

Але трэба падкрэсьліць, што адміністрацыя цэху нядбайна адносіцца да яго работы, у прыватнасьці ў галіне рэалізацыі рабочых прапаноў. Так, напрыклад, рабочы Кац унёс прапанову—замяніць падрыхтоўку форм „салдатаў" гатовай апокай. Прапанова была адобрана, т. Кац атрымаў прэмію. Аднак, мінула ўжо 5 месяцаў, а прапанова не ажыцьцяўляецца. Ячэйка ставіла гэтае пытаньне перад адміністрацыяй, але нічога конкрэтнага не дабілася.

Адміністрацыя цэху павінна неадкладна ажыцьцявіць прызнаную рацыяналізатарскую прапанову і хутчэй падвесьці вынікі работы гаспадарча-разрахунковых брыгад.

Брыгада „ЧЗ"

Кавалевіч, Зэлічонак.



Трэцяй бальшавіцкай—здаровы трактар

Да 1 сакавіка павінен быць скончаны рамонт трактароў і машын

Па-баявому правесьці ўсебеларускі рэйд

Да 1-га сакавіка, згодна ўрадавым дырэктывам павінен быць скончаны рамонт трактароў і сельскагаспадарчых машын. Рамонтная кампанія яшчэ не ва ўсіх МТС і саўгасах пачалася. Там-сям з-за недахопу некаторых інструментаў зусім адкладваюць рамонт. Такое становішча далей нецярпіма.

„Чырвоная зьмена" 8, 9 і 10 студзеня праводзіць усебеларускі рэйд юнкораўскіх брыгад па пытаньню становішча рамонту трактароў, падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі трактарыстых.

У выніку ўсебеларускага рэйду мы павінны дасягнуць ліквідацыі прарыву ў рамонце трактароў. Рэйд павінен мобілізаваць увагу комсамольскай арганізацыі рабочых МТС на пасьпяховае правядзеньне гэтай кампаніі, як найважнейшага вучастку падрыхтоўкі да 3-й бальшавіцкай вясны.

Рэйд павінен выявіць наступнае:

1. Забясьпечанасьць майстэрняў запаснымі часткамі і інструментам. Выкарыстоўваньне ўнутраных рэсурсаў у рамонце (збор металялому, выраб запасных частак у мясцовых майстэрнях). Прычыны, якія тармозяць пасьпяховы рамонт.

2. Ці пераведзены майстэрні на гаспадарчы разрахунак і прогрэсыўна-прэміяльную зьдзельшчыну. Якасьць рамонту.

3. Як організавана праца (брыгады, бесьперапынка, 2-3 зьменная работа, соцспаборніцтва і ўдарніцтва).

4. Заказаньне трактароў і машын.

5. Ці організаваны і як працуюць курсы па падрыхтоўцы трактарыстых і разьяздных мэханікаў, курсы і гурткі па перападрыхтоўцы старых трактарыстых. Замацаваньне іх на працы ў гэтым годзе.

6. Удзел комсамольскіх ячэек у рамонтнай кампаніі і ў падрыхтоўцы трактарыстых.

Райкамолы, ячэйкі, шматтыражкі, штодзёнкі, юнкоры-ўдарнікі! Рыхтуйцеся і па-баявому правядзеце ўсебеларускі рэйд.

За бальшавіцкі разгон рамонтнай. Да першага сакавіка—ніводнага хворага трактара.

„Вясна яшчэ далёка—часу хопіць"

Аб рамонце і падрыхтоўцы да 3-й бальшавіцкай і ня думаюць

ПОЛАЦАК. Падрыхтоўкі да трэцяй бальшавіцкай вясны ў Полацкім раёне яшчэ не пачыналі. Насенныя і кармовыя фонды ня створаны, насеньне не ачышчана. Ні райза, ні райколгасаюз ня маюць пляну сяўбы і падрыхтоўкі да яе. Малацьба збожжа як у колгасах, так і ў аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках поўнасьцю ня скончана. Наогул падрыхтоўка да трэцяй бальшавіцкай вясны на Полаччыне знаходзіцца яшчэ ў „стадыі размоў".

Яшчэ горш з рамонтам сельгасмашын і інвэнтара. У большасьці колгасаў машыны стаяць пад адкрытым небам не рамантаваныя.

Райколгасаюз зусім ня дбае аб організацыі рамонтнай кампаніі.

Рамонт трактароў і прычэпных машын у Ветрынскай МТС толькі яшчэ пачынаецца. Дырэктар МТС разважае так: „Вясна яшчэ далёка,—часу хопіць".

А што з падрыхтоўкай кадраў. Дырэкцыя МТС спадзяецца на тое, што трактарыстых хопіць. Між тым, калі трактаром даць поўную нагрузку, то трактарыстых ня хопіць. Акрамя МТС, колгасы Полаччыны маюць 10 уласных трактароў, якія патрабуюць неадкладнага рамонту. У комуне „Чырвоны артылерысты", Макероўскага с-савету, абодва трактары патрабуюць капітальнага рамонту. Такое-ж становішча і ў астатніх колгасах раёну. Райколгассаюз і тут нічога не зрабіў. Многія колгасы прабавалі рамантаваць трактары, але нічога з гэтага ня вышла. Калі-ж яны зьвярнуліся за дапамогай да дырэктара МТС, дык той адмовіў: „У МТС і без колгасных тактароў хапае працы".

Полацкія майстэрні, якія летась рамантавалі колгасныя трактары, таксама адмовіліся з тае прычыны, што Трактарацэнтр ня даў сёлета мэханіка не хапае частак і т. д. Райколгассаюзу, Райза і РК КСМ усё гэта вядома, але рашучых мер ня прымаецца.

Такое становішча ня можа трываць далей. Трэба рашуча ўдарыць па галавацяпах, якія недаацэньваюць важнасьці бальшавіцкай падрыхтоўкі да вясеньняга севу, і ў самы кароткі час пераключыцца на баявыя тэмпы, каб нагнаць упушчанае.

Мікола Віленскі

Узяць разгон у рамонтнай

Сваячасовая падрыхтоўка да вясеньняй пасеўнай кампаніі—лепшая зарука пасьпяховага яе заканчэньня. Слуцкая МТС пачала ўжо рыхтавацца да вясны. Для рамонту трактароў прымацавана слуцкая майстэрня сельгасмашын.

Аднак узятыя зараз у рамонт трактароў і машын тэмпы ні ў якім разе не забясьпечаць выкананьне пастановы Белколгасцэнтру аб скончаньні гэтай працы да 1-га сакавіка. Слуцкая МТС мае зараз у сваім карыстаньні 35 трактароў з якіх 28 патрабуюць капітальнага рамонту. Тым часам на сёньняшні дзень адрамантавана толькі 6 трактароў. На рамонце працуе ўсяго 7 кваліфікаваных рабочых.

Рамонт сельгасінвэнтара МТС яшчэ не пачынала. Патрэбна адрамантаваць 36 двухлямешных плугоў, 2 трактарныя сеялкі. Аб тымжа, колькі культыватараў і дыскавых барон падлягаюць рамонту працаўнікі МТС і самі ня ведаюць.

Зусім не пачыналі рамонту колгасы, ні адзін з іх не прабаў належна ўліку інвэнтара, які патрабуе рамонту.

Райколгассаюз слаба кіруе рамонтнай кампаніяй. Колгасы нічога не робяць па збору металялому, чакаючы, што райколгассаюз нечым іх забясьпечыць і матэрыяламі і запаснымі часткамі.

У колгасах „Чырвоны маяк" і „Чырвоны Кастрычнік" увесь сельскагаспадарчы інвэнтар знаходзіцца ў самым безгаспадарчым стане—валяецца пад адкрытым небам і псуецца.

Слаба праводзіцца падрыхтоўка кадраў для вясеньняй сяўбы. Пакуль што толькі „абмяркоўваюць" як праводзіць курсы трактарыстых і паляводаў. Усяго 6 паляводаў і 1 механік на сельгасмашынах пасланы на курсы перападрыхтоўкі.

Дагавары на апрацоўку глебы МТС заключыла толькі з 63 колгасамі.

У падрыхтоўцы да вясеньняга севу комсамольская арганізацыя Случчыны пакуль што не разгарнула патрэбнай работы.

МТС, Райколгассаюз і партыйна-комсамольскія арганізацыі Случчыны павінны пераключыцца на баявыя тэмпы і забясьпечыць падрыхтоўку да бальшавіцкага севу.

Брыгадзір „ЧЗ" Канончык Я.

Усесаюзны стралковы паход комсамо[лу]

Аказаць дапамог[у]

грамадзянскаму комсамолу

Да ўсіх комсамольскіх організацый Менскага гарнізону

Дарагія таварышы!

Праз тыдзень спаўняецца гадавіна таго дня, як IX зьезд УсеЛКСМ прыняў гістарычную пастанову аб усеагульным вайсковым навучаньні комсамольцаў.

Гэты факт зьяўляецца зусім невыпадковым.

Мінулы год даказаў поўную правільнасьць і неабходнасьць гэтага важнейшага рашэньня зьезду.

Пад шыльдай салодкіх размоў „аб міры", розных „камісій па разброеньню", зацягнуты ланцугом глыбокага крызісу, капіталізм організоўвае перадзел Кітаю, рыхтуе новыя войны, якія ў першую чаргу накіраваны супроць СССР. Небясьпека новых імпэрыялістычных авантур з кожным днём узрастае.

Наша асноўная політыка—захаваньне міру. Мы поўнасьцю падтрымліваем наш асноўны прынцып „чужой зямлі нам ня трэба, але і аднэй пядзі сваёй зямлі мы нікому ня ўступім".

Асеньнія манэўры Чырвонай арміі і СПА паказалі, што комсамол гатоў да абароны краіны Саветаў.

Вялікая колькасьць колектываў пры дапамозе падшэфных частак гораду ў гэты год завявала асноўную форму вайсковай падрыхтоўкі—вучэбны пункт.

Аднак і ў рабоце нашых вайсковых пунктаў ёсьць рад недахопаў: ня ўсе добра абсталяваны і ўкомплектаваны выкладчыкамі, дрэнна наведваюцца заняткі і г. д.

З 1-га сьнежня, па ініцыятыве баўманскіх стралкоў, ЦК УсеЛКСМ абвешчан усесаюзны стралко[вы па]ход комсамолу, які зьяўляецца[ад]ным з важнейшых і буйне[йшых] мерапрыемстваў у разгорт[ваньні] вайсковай работы. У горадзе [раз]гарнулася падрыхтоўчая рабо[та да] правядзеньня конкурсу. Адна[к] гортваецца яна марудлымі тэм[памі].

На дапамогу грамадзянскаму [ком]самолу ня прышла ніводная [ор]ганізацыя, у тым ліку і вай[сковы] комсамол.

Таму мы сёньня ад імя 15 [ты]сячнага атраду комсамольцаў [Мен]скай гарадзкой організацыі [звя]рачаемся да вас як найхутчэй [прый]сьці на дапамогу грамадзянс[каму] комсамолу ў правядзеньні кон[курсу].

Вазьмеце прыклад з комсамол[ьцаў] і чырвонаармейцаў гораду [...] якія амаль увесь цяжар стра[лко]вага паходу ўзялі на сябе [...]

Мы просім вас перадаць свой [...]шы вопыт стралковага мастац[тва] які вы атрымалі і атрымліваеце ў радох рабоча-сялянскай чырв[онай] арміі і даць інструктарскі с[клад] дапамагчы організацыйна афор[міць] паход.

Мы спадзяемся, што вайс[ковы] комсамол Менскага гарнізону ад[гук]нецца на наш ліст і аказ[ала] сваю дапамогу ў ваенізацыі ком[са]мольцаў, у падрыхтоўцы натур[аль]нага рэзэрву Чырвонай арміі.

Мы зварачаемся да ўсіх ор[гані]зацый вайсковага комсамолу [Мен]скага гарнізону праз стар[онкі] „Чырвонай Зьмены" адгукнуцца [на] наш выклік.

З прывітаньнем Менскі г[а]радзкі камітэт комсамолу



Ваенізіруюцца

Да спаборніцтва гатовы

Пасьля прапрацоўкі выкліку лепшых баўманскіх стралкоў 285 чал. Менскай школы вучнёўства запісаліся ўдзельнікамі стралковага конкурсу.

26 сьнежня адбыўся першы сход вылучаных стралкоў, якія заключылі між сабою соцдагаворы на лепшае правядзеньне стралковага конкурсу. На гэтым-жа сходзе быў абраны штаб.

Стралкі разьбіты на каманды, каманды на групы, групы на аддзяленьні.

Падрыхтован цір і зброя.

Перавалаў.

Супроць трацкісцкага паклёпу на ленінскі комсамол і КП(б)Б

Трацкісты-контрабандысты, фальсыфікуючы гісторыю нашай бальшавіцкай партыі, зьвіваючыся вужам, імкнуцца пралезьці ва ўсе шчыліны на ідэолёгічным фронце з тым, каб працягнуць сваю контр-рэволюцыйную ідэолёгію.

Адным з яркіх узораў працягваньня контрабандным шляхам трацкісцкіх ідэй зьяўляецца кніжка Олікера і Розэнблюма „Нарысы па гісторыі комсамолу Беларусі".

У паказанай кніжцы, па-першае, ігноруецца роля бальшавіцкай партыі, як правадыра міжнароднага пролетарыяту, у тым ліку і правадыра міжнароднага рабочага юнацкага рэволюцыйнага руху, які зьяўляецца неадлучнай часткай рэволюцыйнага руху пролетарыяту.

Па-другое, працягваецца ў гэтай, нічым ня прыкрытай форме ідэалізацыя Бунду, ППС і беларускіх контр-рэволюцыйных нацыяналістычных організацый.

Па-трэцяе, адмаўляецца кіруючая роля партыі юнацкім рухам на Беларусі, па-трацкісцку процістаўляецца комсамол партыі, узводзіцца нячуваны паклёп на КП(б)Б, якая быццам-бы ігнаравала юнацкі рух, не падтрымлівала яго і не зьяўляецца організатарам комсамолу ў БССР.

Па-чацьвертае, не толькі не даецца крытыкі контр-рэволюцыйнаму трацкізму (кніжка вышла ў 1927 годзе), а, наадварот, аўтары запісваюць трацкістых у разрад організатараў і правадыроў Комінтэрну (Ракоўскі).

Аўтары ўмудраюцца запісаць таксама Розу Люксэмбург у разрад бальшавікоў-ленінцаў, якія да канца праводзілі бальшавіцкую лінію.

Фальсыфікуючы факты разьвіцця комсамольскай організацыі, як рэзэрву нашай бальшавіцкай партыі, аўтары пад рознымі відамі працягваюць установкі аб тым, што папярэднікамі ЛКСМБ, з якіх ён вырас, былі меншавіцкія і паўменшавіцкія нацыяналістычныя організацыі моладзі, накшталт Югенд-Бунд, Югенд Фэрэйн і г.д.

Па гэтых асноўных каналах ідзе скажэньне і фальсыфікацыя рабочага юнацкага руху ў БССР.

Прэтэндуючы на „тэорэтыкаў" гісторыі юнацкага руху, аўтары разам з тым узводзяць паклёп і на КП(б)Б, паказваючы організацыю КП(б)Б, як наноснае выпадковае зьявішча, як партыю, якая не кіравала Кастрычніцкай рэволюцыяй, не зьяўлялася авангардам рабочай клясы. Адмаўляючы кіруючую і організацыйную ролю КП(б)Б, аўтары сьцьвярджаюць, што наша партыя прышла да ўлады толькі ў выніку слабасьці меншавікоў, эсэраў і бундаўцаў, якія нібы не аказвалі супраціўленьня. Так на старонцы 95 аўтары сьцьвярджаюць:

„Адным з першых крокаў пасьля перавароту ў лютым павінна было быць стварэньне рэволюцыйнай партыйнай організацыі (падкрэсьлена намі Д. С.) для палітычнага кіраўніцтва краінай і фронтам".

На старонцы 91 аўтары, адмаўляючы кіруючую ролю партыі саветамі, заяўляюць, што:

„Кіраўніцтва саветам належала бальшавіком, што было магчыма толькі дзякуючы поўнай неорганізаванасьці досыць моцных на фронце сацыял-рэволюцыянэраў і Бунду, які меў шырокія сувязі з рабочымі масамі Менску".

Ня цяжка зразумець, што гэта арыі з трацкісцкай „опэры". Яны старанна перапяваюцца гэтымі „гісторыкамі" для таго, каб даказаць, што бальшавікі ня мелі сувязі з масамі, не стаялі на чале рэволюцыі.

Па тэй-жа пратаптанай трацкісцкай сьцежцы ідзе процістаўленьне маладых рабочых дарослым, адмаўляецца кіруючая роля партыі комсамолам, працягваецца авангардысцкая ўстаноўка.

І гэта невыпадкова. Уся кніжка ад пачатку да канца адмаўляе, ігнорує кіруючую ролю партыі юнацкім рэволюцыйным рухам.

Складаючы „гісторыю" на трацкісцкі манер, Олікер і Розэнблюм на 102 старонцы нахабна заяўляюць:

„Цэлы рад спроб рабочай моладзі да утварэньня сваіх організацый былі няўдачнымі, бо ня мелі падтрыманьня з боку партыі".

Аднак будучы ігнараваным нашай партыяй юнацкі рух, паводле аўтараў настолькі разросься самастойна, што сам (?) прымусіў партыю зьвярнуць на сябе ўвагу.

„І толькі пасьля, калі палітычная актыўнасьць і выстарчальная гатоўнасьць рабочай моладзі былі даведзены, партыя пачынае даваць ёй *некаторае* (падкрэсьлана намі, Д. С.) падтрыманьне, што дапамагло утварэньню саюзу моладзі".

Тут аўтары пераходзяць усякія межы хлусьні і фальсыфікацыі. Паўтараючы сьледам за Троцкім авангардысцкую тэорыю процістаўленьня маладых дарослым, комсамолу—партыі аўтары імкнуцца даказаць, што бальшавіцкая партыя ня толькі не організоўвала ЛКСМБ, а нават неахвотна падтрымлівала юнацкі рух.

Хто-ж усё такі організаваў комсамол на Беларусі?

Наконт гэтага аўтары „Гісторыі", гаворачы пра Полацкую організацыю пішуць:

„Пасьля адыходу немцаў распачаліся размовы аб стварэньні рэволюцыйнай організацыі. У гэтым прышоў на дапамогу аддзел народнае асьветы".

Як, бачыце, комсамол паводле гэтых „гісторыкаў", організаваны не бальшавіцкай партыяй, а аддзелам народнае асьветы.

Для чаго патрэбна было такое сьцьвярджэньне?

Аўтары добра ведаюць, што гэта ня так, што гэта хлусьня. Але такая ўжо роля трацкісцкіх контрабандыстаў. Пусьціць пыл у вочы і прыкрыць абшарпанымі лахманамі махінацыі фальсыфікатараў—вось мэта.

Прысваеньне аддзелу Нарасьветы ролі організатара комсамолу — гэта толькі манэўр.

На самой справе аўтары даводзяць іншае. Яны прыкладаюць усе патугі, каб даказаць, што асноваположнікамі комсамолу на Беларусі зьяўляюцца меншавіцкія і паўменшавіцкія нацыяналістычныя організацыі Югенд-Бунд Югенд-Фэрэйн і інш.

Аўтары са старонак гісторыі заяўляюць, што ў Віцебску комсамол вырас з Югенд Фэрэйну, у Мазыры з Югенд-Бунду, а ў Бабруйску.

„28-га лістапада 1918 году, [ка]ля стала вядома аб уступленьні Чы[р]воных войск... Югенд-Бунд [...] фактычна быў комсамолам" (ст[ар.] 116).

З гэтай мэтай Олікер і Розэнбл[юм] ідэалізуюць Югенд-Фэрэйн, Юген[д] Бунд і яго апякуна Бунд.

Гэтыя юнацкія організацыі у [ас]вятленьні Олікера і Розэнблюма атр[ым]ліваюцца наскрозь рэволюцыйны[мі] бальшавіцкімі організацыямі.

Няма ніякай патрэбы даказва[ць] што як Югенд-Ферэйн, так і Юген[д] Бунд ні ў якай меры не маглі і [не] зьўляліся па зьмесьце сваёй работ[ы] і па сваіх мэтах і задачах папярэдні[]камі комсамолу.

Даволі напомніць, што Югенд-Бу[нд] організован Бундам і працаваў па[д] яго кіраўніцтвам. Як далёка Бу[нд] заўсёды быў ад бальшавізму—кожна[му] вядома. І тым больш ясна, што яго вырадак Югенд-Бунд ніколі [ні]чога агульнага ня меў і ня мог ме[ць] з комсамолам, організаваным і кіра[]ваным партыяй Леніна.

Паказваючы гісторыю іменна ў т[а]кім выглядзе. трацкісцкія элементы спачатку юнацкія організацыі робяць „перадавым атрадам соцыяльнай рэволюцыі" (стар. 136), прыпісваюць ім авангардысцкую ролю ў Кастрычніку на Беларусі, даводзяць, што „з боку палітычных партый (стар. 127) моладзь не знайшла канечнага падтрыманьня", а пасьля ставяць знак роўнасьці паміж комсамолам і Югенд-Бундам.

Калі да гэтага дадаць сьцьвярджэньне, што „бальшавіцкая партыя мела у Беларусі абмежаваную базу", што яе ячэйкі „ня мелі ў лікай сувязі з мясцовай рабочай масай" (стар. 126), дык стане ясным, якую мэту маюць гэтыя фальсыфікатары.

Падобных да вышэй праведзеных

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА № 300 (1569)

Лясная эстафэта

...нчаецца першы этап ...ход комсамольскім эшалёнам лесу!

...аёнамі лесу сустрэлі пленум ЦК ЛКСМБ

...ЧВУСЫ. Комсамольскімі абозамі імя Райпарткконфэ-...ы пленуму ЦК ЛКСМБ вывезена 23 сьнежня 510 ...раў дроў. Вывазку працягваем. ШАПІРА.

* * *

...ЗСЛАЎЕ. У падарунак 4-му пленуму ЦК ЛКСМБ сіла...мольцаў Заслаўшчыны падвезена да чыгуначных ...1200 падвод лесаматар'ялаў, пагружана для адпраў-...Мск 33 вагоны дроў. ЕЎДАКІМАЎ.

Рушым комсамольскі эшалёны

Троxдзеньнік баявых спраў

...—шэф усеагульнага навучаньня... Заслаўская організацыя ...ІБ па-бальшавіцку ажыцьцяўляе гэты лёзунг, праводзячы ...рэтыя мерапрыемствы па вывазцы і адгрузцы апалу школам ...ку.

...ньнік лесавывазкі і ад...оў і лесаматар'ялаў распачаўся ... сьнежня. Па ўсіх вёсках ...і сельсаветамі накіравалі ...рыгады комсамольцаў з мэтай ...нь лесазагатоўкі, узьняўшы ...ую і гужавую сілу раёну. ...ершы і другі дзень 3-х дзеньніка ...перавыкананьне плянаў.

На трэці дзень колгасьнікі, лесарубы, комсамольцы і рабочыя грузілі вагоны. Аднак вагонаў не хапіла. На станцыі Ратамка загрузілі ўсяго 13 вагонаў, засталося дроў на 5 вагонаў. На станцыі Беларусь —7 вагонаў, засталося дроў на 8. У Радашковічах загрузілі 13 вагонаў.

Упрыгожаны лёзунгамі дрывяны маршрут для школ пад вечар рушыўся на Менск.

Прыклад Заслаўшчыны павінен пераняць увесь комсамол Беларусі.

Дардон, Кугель

Брыгадны мэтод працы вырашае

...мсомольскі колектыў саўгасу ...зьдзе БССР", (Любаньскі ...біўся значных посьпехаў ў ...аньні плянаў нарыхтоўкі і ...дроў.

...рганізаваным комсамольскімі ...ботніку ўдзельнічала 80 ч...

Гэты суботнік зьявіўся добрым прыкладам таго, як трэба організоўваць працу і растаўляць сілы на лесараспрацоўках, давёў што брыгадны мэтод працы вырашае посьпех у выкананьні плянаў лесанарыхтовак. М. Булавіцкі.

3 і 15—сьведкі прарыву

...таннарыхтовак і вывазкі лесама...ў і апалу на 20 сьнежня ...Шеўскім леспрамгасе сьведчыць аб тым, што партыйная і комсамольскія ячэйкі і сельсавет не ...лізвалі грамадзкасьці на барацьбу за выкананьне гэтай важнейшай ...гаспадарча-політычнай кампаніі.

Рад сельсаветаў яшчэ не вывез ...одная кубамэтра дроў, спасылаючыся на „об'ектыўныя" прычыны — бездарожжа і г. д. У выніку—4 квартал плян дзелавой драўніны выкананы ўсяго на 3 проц. і ...лу на 15 проц.

Уназваваныя РВК не ўдзялілі патрэбнай увагі вывазцы лесаматар'ялаў і дроў, а часам ігноруюць гэту справу. Партыйныя і комсамольскія ячэйкі, сельсаветы і праўленьні колгасаў павінны ў сьнежні месяцы забясьпечыць такія тэмпы, каб канчаткова ліквідаваць прарывы ў нарыхтоўках і вывазцы лесу.

Маса колгасьнікаў павінна быць мобілізавана на выкананьне дагавароў з Леспрамгасам. Да кулацказаможных гаспадарак, якія ўхіляюцца ад выкананьня заданьня, павінны быць прыняты самыя рашучыя меры. Лесанарыхтоўкі і вывазку неадкладна пераключыць на баявыя тэмпы. М. Каласоўскі

У дні ўсесаюзнага сталінскага | Першы крок зроблены | Да 4-га пленуму ЦК ЛКСМБ

Узброіўшыся пуцёўкай 4-га пленуму, рушыць увесь ЛКСМБ на далейшую барацьбу за канчатковае аздараўленьне чыгуначнага транспорту

Справаздача выяздных рэдакцый „Чырвонай Зьмены" у Гомелі і Магілеве

Конкрэтнымі справамі сустрэлі пленум

Комсамольская організацыя Жлобінскага чыгуначнага вузла правяла вялікую падрыхтоўчую работу да пленуму ЦК ЛКСМБ.

Так, ячэйка мэханічнага цэху дэпо перавяла 4 комсамольскія варштаты на гаспадарчы разрахунак.

Комсамольскія ўдарныя брыгады на новых работах у дэпо пераводзяцца на зьдзельшчыну.

Комсамольскі ўдарны варштат перавыконвае вымернікі. Гаспадар гэтага варштата, комсамолец, занесены на чырвоную дошку. Комсамолія мэханічнага цэху ўключылася ў месячнік збору рацыяналізатарскіх прапаноў. Ліквідавана абязьлічка цісков. 7 комсамольскіх ударных брыгад пераведзены на гаспадарчы разрахунак і поўнасьцю выконваюць вымернікі.

Па ініцыятыве ячэйкі мэханічнага цэху організован беларускі гурток, які працуе 3 разы ў тыдзень. Комсамольцы ў штодзённай рабоце на вытворчасьці ўжываюць толькі беларускую мову.

Шырока разгорнут рабкораўскі рух. Штодня выходзіць насьценгазэта. Рэдкалегія мэханічнага цэху організавала штодзёнку ў кузьні. Узята на буксір рэдколегія цэхячэйкі пад'ёмачнага рамонту, выпушчан адзін нумар насьценгазэты і зараз організавана работа рабкораў.

У мэханічным цэху на працягу 2-х месяцаў былі 4 выпадкі браку і адзін выпадак браку па лініі комсамольскіх рамонтных брыгад. Аднак, насьценгазэта своечасова мобілізавала ўвагу ўсёй грамадзкасьці на гэтых недахопах.

Ударнік-рабкор Міхась.

Замацаваць дасягнутыя посьпехі

Людзі звыкліся з прарывам. Людзі сыстэматычна не выконваюць транфінплян. А комсамольскае кіраўніцтва не мобілізоўвала організацыю на ліквідацыю прарываў.

Калі цягнік сутыкнецца ў дарозе і яму падаюць дапамогу з рэзэрву, комсамольскае кіраўніцтва не турбуецца.

— У нашых умовах гэта, пажалуй, звычайна.

І нічога не рабілі. Опортуністычнае кіраўніцтва комсамолу дэпо—Гомель зьнял.

У дзень прыходу новага комсамольскага кіраўніцтва прыступіла да работы і выязная рэдакцыя „Чырвонай Зьмены".

З новым кіраўніцтвам, з оргтройкай гомельскага гаркамолу выязная рэдакцыя працавала над тым, каб да 4-га пленуму ЦК ЛКСМБ зрабіць пералом у рабоце чыгуначнага комсамолу.

У першыя дні вельмі даваўся ў знак спадчына былога опортуністычнага кіраўніцтва. Комсамолец Шкудовіч заснуў на паравозе. Толькі за 2 тыдні сьнежня быў 41 выпадак зрыву спаранай машыністымі і 40 выпадкаў—качагарамі. Машыністы Чураеў, з-за дрэннага рамонту праведзенага сьлесарам Сярковым, заварыў куліс ны камень, і цягніку прышлося высылаць рэзэрв.

Такіх фактаў шмат.

Факты гаварылі аб тым, што тут дрэнна выконваецца загад т. Андрэева, дрэнна ажыцьцяўляюцца ўказаньні т. Сталіна.

Усяму гэтаму аб'явілі жорсткую барацьбу. Зьбіралі паравозьнікаў, гаварылі аб дарэмных прастоях паравозаў, аб тым, што шмат часу трацяць на набор вугалю, аб астаноўках у дарозе, аб павялічэньні прабегу паравоза на гадзіну ў суткі, аб перабудове комсамольскай работы. Разьбілі на групы. Вынік—комсамольскі паравоз ОЧ—2 за 15 дзён сьнежня даў экономію ў апале на 27 руб. 69 кап., у змазцы 26 руб. 32 кап.

Зьбіралі рамонтнікаў дэпо. Перабудавалі комсамольскую работу па-новаму.

Адчуваецца ўжо зрух (праўда, яшчэ слабы) у палепшаньні рамонту. Ажывілася работа 2 комсамольскіх паравозаў, ОЧ-2 і 7598, якія переведзены на гаспадарчы разрахунак,

Ударная комсамольская брыгада прыбіральніц вагонаў дэпо-сартовачная пераходзіць на гаспадарчы разрахунак.

Організаваны ўдарныя комсамольскія брыгады ў ступянёвым дэпо, ў аддзеле сільных товаў і сартавальні.

У дні сталінскага паходу комсамольская організацыя чыгункі звыш пляну адрамантавала адзін паравоз і 2 вагоны ў падарунак 4-му пленуму ЦК ЛКСМБ.

Гаркомам комсамолу і „Чырвонай зьменай" была наладжана сустрэча гарадзкіх комсамольскіх колектываў з комсамолам чыгункі для абмену вопытам па рэалізацыі 6 указаньняў т. Сталіна.

Адзначаныя факты гавораць аб зруху ў рабоце комсамольскай організацыі Гомельскага чыгуначнага вузла.

Дасягнутыя ў дні сталінскага паходу посьпехі неабходна замацаваць і яшчэ больш шпаркімі тэмпамі ісьці да новых перамог.

Комсамольская організацыя Гомельскага чыгуначнага вузла для замацаваньня посьпехаў павінна ўсю сваю работу перанесьці ў комсамольскую групу, брыгаду, паравоз. Больш часта організоўваць сустрэчы паравозьнікаў з рамонтнікамі, сустрэчы гарадзкіх колектываў з чыгуначнікамі для перадачы вопыту, організоўваць нарады спэцыялістых з комсамольцамі па наладжваньню работы вагоннага і паравознага парку, пераводу паравозаў і брыгады на сапраўдны гасразрахунак.

Комсамольская організацыя павінна ўдзяліць больш увагі маршрутызацыі, рабоце ячэйкі грузчыкаў, выпуску штодзёнак у цэхах, брыгадах, на паравозах.

Гаркамол не павінен паслабляць кіраўніцтва чыгуначнай комсамольскай організацыяй.

Цішка Верны.

На рэйках цягнікі пойдуць здаровыя

Аб опэрацыйным кіраўніцтве комсамолам чыгункі

Пра работу комсамольскай організацыі чыгуначнага вузла Магілеўскага раёну „Чырвоная зьмена" ужо шмат пісала.

Дзякуючы неопэрацыйнаму, не конкрэтнаму кіраўніцтву раённага камітэту комсамолу і партыйнай організацыі чыгункі—комсамольскі колектыў цягі да апошняга часу не перабудаваў сваёй работы, не стаў сапраўднай баявой адзінкай на чыгуначным вузьле.

У парадку падрыхтоўкі да 4-га пленуму ЦК ЛКСМБ, пры дапамозе выязной рэдакцыі «Чырвонай зьмены", у рабоце комсамолу вызначыўся пэўны пералом.

Паравоз, організаваны комсамольцамі, ужо пры першых паездках дабіўся значнай экономіі апалу. У дэпо складзены комсамольскія брыгады. Па ініцыятыве комсамольскай організацыі праведзена тэхнічная конфэрэнцыя вузла.

У перабудове комсамольскай работы намечаны правільныя шляхі праз разбуйненьне ячэйкі дэпо, праз організацыю спэцыяльных ячэек пры электростанцыі, ТПО, ячэйкі паравозьнікаў, груп у цэхах абточкі, пэрыодычнага рамонту і г. д.

З мэтай зьнішчыць разрыў паміж гарадзкой і чыгуначнай організацыямі комсамолу і перанесьці лепшы вопыт на чыгунку, гарадзкім камітэтам комсамолу, сумесна з выязной рэдакцыяй, на агульна-гарадзкой нарадзе сакратароў быў пастаўлен даклад колектыву цягі і распрацаваны конкрэтныя мерапрыемствы. Шоўкавая фабрыка, завод імя Сталіна і інш. абавязаліся організаваць дапамогу транспорту матэр'яламі і запаснымі часткамі. Завод „Чырвоны адраджэнец" абавязаўся своечасова выконваць заказы.

Адным з важнейшых мерапрыемстваў, прынятых нарадай, зьяўляецца організацыя дыфэрэнцыяваных брыгад па перабудове комсамольскай работы. Так, шоўкавая фабрыка павінна была вылучыць брыгаду па перабудове работы ячэек, Пэдтэхнікум, Пэдінстытут—па рэалізацыі пастановы ЦК аб сярэдняй школе, Політасьветтэхнікум—па перабудове політвучобы і г. д.

Былі ўстаноўлены спэцыяльныя тэрміны для працы брыгад: з 20 сьнежня па 1-е студзеня.

Бясспрэчна, што выкананьне гэтых конкрэтных мерапрыемстваў дапамагло-б сапраўды зьнішчыць разрыў паміж гарадзкой і чыгуначнай організацыямі, вывела-б чыгуначны колектыў цягі ў шэрагі перадавых. Нажаль, яны засталіся толькі на паперы.

Сёньня канчаецца тэрмін, але брыгады да працы яшчэ не прыступілі. Раённы камітэт комсамолу абмежаваўся рэзолюцыяй, не здолеўшы практычна рэалізаваць каштоўнейшыя мерапрыемствы.

Такім чынам, пералом, што быў намеціўся ў колектыве цягі пры організацыі работы па падрыхтоўцы да 4-га пленуму ЦК і ў прыцягнасьці да пастаноўкі пытаньня аб чыгуначным транспарце, не замацаваны, да канца не даведзены.

Ня гледзячы на пералом у рабоце, колектыў цягі Магілеўскага вузла прышоў да пленуму ЦК ЛКСМБ з нездавальняючымі паказчыкамі.

Магілеўскі раённы камітэт комсамолу павінен наладзіць кіраўніцтва колектывам цягі такім чынам, каб справа не разыходзілася са словам, рэалізаваць пастанову нарады сакратароў, устанавіць праверку выкананьня, правесьці ў жыцьцё сваю пастанову ў адносінах пасылкі сакратара колектыву, устанавіць штодзённае опэрацыйнае кіраўніцтва—вось задача. Э. Каганская


Паравоз рамантаваць ударна

...ьвярджэньняў у кніжцы шмат. ...не абмяжуемся на гэтым.

* * *

...Пакінікія выпады супроць комсамолу, самым цесным чынам зьвязаны ... і вынікаюць з тэй непартыйнай, ...ленінскай характарыстыкі рэволюцыйнага руху, якую разьвіваюць гэтыя „майстры" „нарысаў гісторыі".

Давол... паказаць на той факт, што ...тікер Разэнблюм лічаць соцыял-дэмократычную партыю Польшчы „вельмі вытрыманай, марксысцкай організацыяй па тэй прычыне, што на чале яе стаялі такія выдатныя рэволюцыянэры—марксысты, як Роза Люксембург".

Сьлепым за ідэалізацыяй люксэмбургіянства ідэалізуецца контр-рэволюцыйны БУНД, які, нібыта быў організован „кіраўніком яўрэйскага рабочага (падкрэсьлена намі—Д. С.) руху". І яму партыя Бунду, паводле аўтараў „была кіраўніцай яўрэйскага пролетарыяту ў барацьбе за экономічнае, грамадзкае і політычнае вызваленьне".

У канцы гэтага разьдзелу даказваецца, што рабочая кляса і сялянства ... валі цэнку розным партыям не па ... х „класавай рэволюцыйнасьці, а на ...ым, я яна (партыя—Д. С.) абараняе ...нацыянальныя інтарэсы". Тут аўтары ...проціпастаўляюць нацыянальнае пытаньне агульным клясавым інтарэсам пролетарыяту, не разумеючы іх сувязі.

* * *

Лепш ня раз падкрэсьляваў той вялікай важнасьці факт, што меншавікі, эсэры да іх падобныя організацыі, для таго, каб уплываць на рабочыя масы, звічалы апранацца ў соцыялістычную вопратку, прыкрывацца „левымі" фразамі. Гэта ўлюбёны манэўр усіх соцыял і нацыянал-фашысцкіх партый На прыкладзе дзейнасьці меншавікоў, эсэраў, ППС, і г. д. рабочая кляса на ўласным вопыце пераканалася ў контр-рэволюцыйнай сутнасьці гэтых організацый.

Як-жа пасьля гэтага можна, ня зьдраджваючы рабочай клясе, не парываючы з бальшавізмам, заяўляць, што меншавіцкія і нацыянал-соцыялістычныя партыі адыгрывалі ў часе рэволюцыі 1917 г. рэволюцыйную ролю?

Ясна, што погляды і лінія, выкладзеныя гэтымі „гісторыкамі", ня толькі ня маюць нічога агульнага з бальшавізмам і ленінізмам, але знаходзяцца ў простай процілегласьці з імі.

Кніжка прадстаўляе з сябе конглёмэрат наклёпаў на партыю, на бальшавізм, на ленінскі комсамол.

* * *

ЛКСМБ, які організован і працуе пад выпрабаваным кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, на ўсім гістарычным працягу свайго існаваньня быў і будзе верным праваднікам генэральнай лініі партыі. Усякія спробы ахаяць комсамол, аслабіць яго згуртаванасьць вакол ленінскай партыі сустрэнуць за раз, як і заўсёды, сакрушальны адпор.

Комсамол Беларусі, як і ўсяго Савецкага Саюзу, мае свае баявыя традыцыі, сваю бальшавіцкую загартаванасьць і слаўную гэроічную гісторыю Яго дзейнасьць і барацьба самым цесным чынам зьвязаны з організатарскай, кіруючай роляй КП(б)Б у стварэньні Кастрычніка на Беларусі. Гэту гісторыю неабходна падагуліць на аснове бальшавіцкай мэтодолёгіі. ЦК ЛКСМБ бясспрэчна ў найкарацейшы тэрмін правядзе такую работу.

Трэба неадкладна выкінуць троцкісцкі хлам, які і да сеньнешняга дня засьмечвае мазгі комсамольцаў некаторых ячэек.

Патрэбна рашуча адкінуць усё, што фальсыфікуе, скажае бальшавіцкі шлях узьнікненьня і разьвіцьця вернага памочніка нашай партыі—ленінскага комсамолу.

А. Джэлюк, В. Самуцін. („Зьвязда")

Змагацца за сапраўдную політэхнічную школу

Мацней агонь па тых, хто скажае прынцыпы політэхнізму, хто „ачорнарабочвае" практыку студэнтаў

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб школе—гэта конкрэтная, разгорнутая праграма за якасьць навучаньня, за політэхнічную школу,

Комсамол мае значныя посьпехі ў барацьбе за політэхнічную школу.

Аднак факты, якія мы сёньня зьмяшчаем, гавораць аб тым, што пастанова ЦК УсеКП(б)Б аб школе некаторымі комсамольскімі організацыямі ажыцьцяўляецца слаба. У радзе мейсц („Комунар" і інш) заводзкія організацыі не дапамагаюць школе.

У Барысаўскім пэдтэхнікуме і Магілеўскім політасьветтэхнікуме студэнтаў выкарыстоўваюць, як чорнарабочых.

Політэхнічная школа патрабуе ўвагі ня толькі комсамолу, але і ўсёй пролетарскай грамадзкасьці.

Комсамол і ўся пролетарская грамадзкасьць павінны павясьці рашучую барацьбу з скажэньнямі ідэй політэхнізму з тэндэнцыяй „ачорнарабочваць" студэнтаў.

Вытворчая праца павінна быць падпарадкавана навучаньню ў школе.

Барацьба за політэхнічную школу — гэта барацьба за ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК УсеКП(б), гэта барацьба за комуністычнае выхаваньне новага пакаленьня.

Політэхнізацыя—справа ня толькі ФЗС

Па ініцыятыве комсамольскага колектыву на заводзе „Комунар" адбылася політэхнічная конфэрэнцыя 2-х прымацаваных да заводу ФЗС сумесна рабочымі заводу. Конфэрэнцыя адзначыла той зрух, які маюць школы ў ажыцьцяўленьні пастановы ЦК УсеКП(б).

Аднак, праца школ па вытворчаму навучаньню на заводзе і ў рабочых пакоях не адпавядае запатрабаваньням, прад'яўляемым новай політэхнічнай школе. Вучэбныя пляны ня ўвязваюцца з працай на заводзе і ў майстэрнях. Атрыманы для школы такарны станок не выкарыхтоўваецца.

Партыйныя і грамадзкія організацыі заводу работай школ ня цікавяцца. На політэхнічнай конфэрэнцыі з парколектыву, дырэкцыі і ІТР заводу ніхто ня прысутнічаў.

Паводле пляну ў новай заводзкай пабудове адводзіўся пакой для піонэр-базы школы. Кіруючыя організацыі заводу знайшлі, што база у якой налічваецца 550 піонэраў і 620 акцябрат, можа абыйсьціся і без пакою на заводзе.

Гэтыя думкі выказвае і рэдактар шматтыражкі т. Пісман, гаворачы: „Піонэраў і вучняў можна зусім на завод ня пускаць". Бюро партыйнага і комсамольскага колектываў павінны неадкладна разглядзець пытаньні стану рэалізацыі пастаноў партыі аб школе.

Ш. Б.

Не скажаць прынцыпаў політэхнізацыі!

У Барысаўскім пэдтэхнікуме не створаны адпаведныя ўмовы для політэхнізацыі. Сьлясарнай майстэрні зусім няма, а сталярная знаходзіцца ў вопытна-практыкавальнай школе, якой карыстаецца і тэхнікум.

Нядаўна пачалася індустрыяльная практыка на заводзе „Комбінат". Студэнты працуюць тут толькі ў адным цэху і такім чынам ведаюць вытворчыя процэсы толькі аднаго цэху. Загадчыкі цэхаў дрэнна адносяцца да практыкантаў, скарыстоўваючы іх, як чорнарабочых. Адміністрацыя тэхнікуму не рэагуе на факты скрыўленьня політэхнізацыі.

Л. Гарэцкі.



Першыя перамогі не даюць права супачыць на лаўрах

Комсамольскі колектыў фабрыкі „Комінтэрн" (Гомель) у дні сталінскага паходу дабіўся раду посьпехаў. У выніку перабудовы работы на новаму, фабрыка выканала свой прамфінплян. Колектывам організавана адна групавая гаспадарча-разрахунковая брыгада ў цэху моладзі з 10 брыгад па ўсёй фабрыцы.

Комсамольскі колектыў налічвае 80 преміяваных ударнікаў.

Аднак, першыя дасягненьні не даюць права колектыву супачыць на лаўрах. На фабрыцы ёсьць факты ўраднілаўкі, ня ўсе яшчэ брыгады перайшлі на гаспадарчы разрахунак.

Брыгада „ЧЗ"
Дворына, Шнээр. Ітлін

Пачын Віцебшчыны-усёй комсамольскай організацыі Бел

Менск, прымай баявы выклік комсамоліі Віцебску!

Конкрэтнымі справамі шэфства фабрычна-заводзкіх організацый КСМ саўгасна-колгаснымі—узмацнім барацьбу за організацыйна-гаспадарч ўмацаваньне колгасаў

Соцыялістычная форма работы ў разгортваньні конкурсу нізавога друку—гарантыя пасьпяховай барацьбы за організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў.

Пачын у соцыялістычным спаборніцтве паміж гарадзкімі організацыямі комсамолу зрабіла 14-ці тысячная організацыя Віцебску. Менская комсамолія выклікана на разгорнутую дапамогу саўгасна-колгаснаму друку ў перадачы яму лепшага вопыту соцыялістычных форм работы фабрычназаводзкага друку. У правядзеньні масавай работы з юнкорамі па гаспадарчаму ўмацаваньню колгасаў.

Гэты выклік мае выключнае політычнае і гаспадарчае значэньне ў барацьбе комс на гаспадарчым фронце.

Менская комсамольская організацыя п на на выклік віцебскай комсамоліі адка радам практычных мерапрыемстваў па нізацыйна - гаспадарчаму ўмацаваньню гасаў, мобілізаваўшы на гэтую справу к молію, юнкораў, усю рабочую і колг моладзь гораду і прыгараднай паласы.

Міжраённае соцыялістычнае спаборн ў організацыйна-гаспадарчым умацав колгасаў, пачатае віцебскай комсамоліяй вінна стаць набыткам усёй комсамол організацыі Беларусі, кожнай організ комсамольца паасобку.

УМОВА

на соцыялістычнае спаборніцтва Віцебскай комсамольскай організац з Менскай у правядзеньні конкурсу, абвешчанага газ. „Правда"

Абвешчаны газэтай „Правдой" усесаюзны конкурс мае вялікае політычнае значэньне. Організацыя і правядзеньне конкурсу—справа ўсёй комсамольскай організацыі і рабоча-колгаснай моладзі, адзін з магутных сродкаў барацьбы за організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў, што зараз зьяўляецца галоўнай задачай у колгасным будаўніцтве, неадлучнаю часткай усёй барацьбы за посьпехі соцыялістычнага будаўніцтва.

Каб дабіцца лепшых вынікаў у барацьбе за організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў, у правядзеньні конкурсу „Правды", выклікаем Менскую комсамольскую організацыю на соцспаборніцтва.

Мы бярэм за аснову нашага спаборніцтва ўмовы конкурсу, абвешчаныя „Правдой", умовы спаборніцтва друку БССР, УССР і Паўн. Каўказу.

Прымаем на сябе наступныя абавязкі:

Пры кожным колгасе, саўгасе, дзе няма насьценных газэт, організаваць іх, а пры тых, дзе газэты ёсьць, дабіцца іх сыстэматычнага выхаду. Пры колгасе „1-га Мая" і колгасе „Сталіна" організаваць шклографічныя шматтыражкі з выхадам ня менш аднаго разу ў пяцідзёнку.

Ставячы перад сабой, як адну з першачарговых задач, барацьбу за высокі ўраджай соцыялістычных палёў і павышэньне таварнасьці колгаснай гаспадаркі, правесьці наступнае:

Організаваць разам з агросоцыялістымі брыгады для дапамогі колгасам увесьці правільны севазварот.

Пры ўсіх колгасах і саўгасах організаваць гурткі па вывучэньню агротэхнікі сваёй спэцыялізаванай гаспадаркі.

Дабіцца поўнага выкананьня плянаў комплектаваньня МТФ і СТФ.

У самы бліжэйшы час поўнага выкананьня колга саўгасамі сваіх плянаў таварнай продукцыі.

У аснову барацьбы за таварнасьць СТФ палажыць бу за „тону-апаросу".

Організаваць пры дапамо вуковых сіл масавыя лекцыі клады ва ўсіх колгасах і са па пытаньню павышэньня ўр насьці, барацьбы з эпізоотыяй

Організаваць пры кожным сьвінарніку і аборы ў комсамольскія брыгады і вы пры іх штодзенкі „За работ новаму".

У саўгасах усю работу дзіць пад кутом погляду рэа шасьці ўказаньняў т. Сталін

Організаваць пасылку ю фабрычна-заводзкага друку ў ты колгасаў і саўгасаў дла гі і перадачы вопыту.

Чакаем вашага адказу вы клік праз наш ЦО—„Чыр.Зь

Пастанова Бюро Віцебскага Гаркому ЛКСМБ ад 22--XII-31 г.

Абвешчаны газэтай „Правда" усесаюзны конкурс нізавых газэт саўгасаў, колгасаў і МТС мае вялікае політычнае значэньне ў мобілізацыі рабсельюнкораў, нізвога друку і шырокага колгаснага актыву на барацьбу за выкананьне задач, пастаўленых партыяй у галіне організацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня колгасаў.

Аднак, абвешчаны конкурс яшчэ не знайшоў належнага праламленьня і ўдзелу ў ім комсамольскай організацыі.

Праведзеная работа па конкурсу зьяўляецца яшчэ невыстарчальнай. Тое, што праведзена, зьяўляецца толькі першым крокам у разгортваньні масавай работы па ўдзелу ў конкурсе юнкораўскіх мас і маладых колгасьнікаў.

На аснове ўказаньняў ЦК КП(б)Б і Цэнтральнай конкурснай камісіі пры ЦО „Зьвязда", усім ячэйкам КСМ прыступіць да ажыцьцяўленьня конкрэтных мерапрыемстваў па конкурсу, каб на гэтай аснове забясьпечыць актыўны ўдзел комсамолу і ўсёй рабоча-колгаснай моладзі.

Конкрэтна правесьці наступнае:

1. Адчыненыя сходы комсамольскіх ячэек з шырокім прыцягненьнем рабоча-колгаснае моладзі і абгаварыць пытаньне аб організацыі і практычным правядзеньні конкурсу

2. Склікаць спэцыяльныя нарады сэкратароў гарадзкіх і вясковых колектываў і ячэек КСМ па пытаньню аб мерапрыемствах да конкурсу „Правды" і абгаварэньню соцумовы на правядзеньне конкурсу з Менскай КСМ організацыяй.

3. Склікаць спэцыялізаваную нараду юнкораў асобна па жывёлагадоўчых, ільнаводчых саўгасах і колгасах па пытаньню конкурсу.

4. Організаваць пасылку брыгад рабочай моладзі ў саўгасы і колгасы для дапамогі ў організацыі і практычным правядзеньні конкурсу.

5. У парадку опэрацыйнай работы на чарговых пасяджэньнях сэкратарыяту і бюро заслухаць даклады сэкратароў колектываў і ячэек аб практычнай рабоце па правядзеньню конкурсу „Правды"

6. Дабіцца організацыі і пашырэньня сеткі штодзенак, насьценгазэт на прадпрыемствах, у саўгасах і колгасах, а побач з гэтым павышэньня іх якасьці.

7. Вызначыць прэмію для ўзнагароды лепшых штодзенак, насьценгазэт і юнкораў за пасьпяховую работу па конкурсу.

8. Улічваючы вялікую п вую важнасьць конкурсу, каць на соцыялістычнае спа ва ў лепшым удзеле КСМ ор цыі рабоча-колгаснай мола ўсесаюзным конкурсе „Пра Менскую комсамольскую ор цыю.

Гарком прызывае ўсю Віц комсамольскую організацыю класьці ўсе сілы і бальша настойлівасьць для лепшага дзеньня конкурсу і выка соцумовы з Менскай організа

Адказны рэдактар Л. ПЭР

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2523